## Вывучэнне драматургічных твораў В. Ткачова на падрыхтоўчым аддзяленні ВНУ

*Каралёва А.А.,* г. Гомель, УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»

У праграму ўступных экзаменаў па беларускай літаратуры ўключана пытанне «Творчасць сучасных пісьменнікаў-землякоў». Па выніках апытвання слухачоў падрыхтоўчага аддзялення ГДУ імя Ф.Скарыны, сённяшнія выпускнікі школ Гомельскай вобласці мала знаёмы з творчасцю пісьменнікаў свайго рэгіёна. Часцей за ўсё прыводзяцца прозвішчы паэтаў І. Катлярова і С. Шах, празаіка і драматурга В. Ткачова. Старшыня Гомельскага аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў, аўтар некалькіх зборнікаў твораў, у тым ліку для дзяцей і юнацтва, зборнікаў гумарыстычных твораў, Васіль Юр'евіч Ткачоў плённа працуе ў драматургічным жанры. Аднак творчасць пісьменніка амаль што не асветлена ў навуковай і метадычнай літаратуры. Тым не менш творы В. Ткачова вызначаюцца не толькі цікавымі сюжэтамі, але і павучальнасцю, а таксама запамінальнымі характарыстыкамі персанажаў.

Героі драматургічных твораў В. Ткачова – звычайныя беларусы, людзі характарныя, намаляваныя ў звычайных і незвычайных абставінах, са сваімі клопатамі, думкамі і жыццёвымі прынцыпамі. Многія праблемы, закранутыя пісьменнікам у творах, – гэта праблемы не толькі сучаснай Гомельшчыны, але і Беларусі наогул. Тым больш, як прызнаецца пісьменнік, сюжэты твораў заснаваны ў асноўным на рэальных падзеях. Персанажы драматургічных твораў В. Ткачова – звычайныя людзі, якія жывуць менавіта на Гомельшчыне, знаходзяцца побач з намі. У пісьменніка, здаецца, няма персанажаў, якіх бы ён не любіў, але ёсць з'явы, з якімі ён мірыцца не жадае.

На занятках пажадана прапанаваць слухачам прачытаць і прааналізаваць тыя творы Васіля Ткачова, у якіх адлюстравана жыццё сучаснага беларускага грамадства і характэрныя рысы нашых сучаснікаў. У кароткім аглядзе драматургічнай творчасці В.Ткачова выкладчыку неабходна звярнуць увагу слухачоў на *жанравыя асаблівасці* твораў: аўтар працуе ў жанры *меладрамы* («Вокны», «Хтосьці ходзіць за акном...»), *трагікамедыі* («Шаройка ў блакадзе»), *камедыі* («Лесвіца», «Мяжа, або Вяртанне ў чаргу 91-га...»), *драмы* («Сівы бусел»). Акрамя гэтага, трэба адзначыць і

*тэматычную разнастайнасць п'ес:* лёс людзей, пакінутых пасля аварыі на ЧАЭС («Шаройка ў блакадзе», «Шкірдзюкі займаюць абарону»), жыццёвыя прыярытэты сучаснай моладзі («Курорт для зяця»), прырода і чалавек («Дрэва, або Жыццё ў адсутнасць дажджу»).

Галоўнай памылкай слухачоў падрыхтоўчага аддзялення на занятках па беларускай літаратуры з'яўляецца пераказ сюжэта драматургічнага твора. Каб пазбегнуць гэтага, выкладчык павінен нагадаць пра адзінства ў п'есе канфлікту і характараў, згодна з канфліктам драматургічнага твора разглядаць характары ў п'есах. Так, у трагікамедыі В. Ткачова «Шаройка ў блакадзе» канфліктам з'яўляецца неадпаведнасць існуючай рэальнасці і сапраўдных жыццёвых мэтаў галоўнага героя – Ігната Шаройкі, які не згаджаецца з патрабаваннямі ўлады пакінуць свой дом у выселенай вёсцы і мае цвёрдую волю не даць разграбіць тое, што нажыў на працягу ўсяго свайго жыцця. У слухачоў узнікае два складаных пытанні: чаму Шаройка застаецца ў выселенай вёсцы і чаму ў канцы п'есы падпальвае сябе разам са сваёй хатай? Неразуменне паводзін галоўнага героя часта прыводзіць слухачоў да спрошчанага тлумачэння ўсёй п'есы. Каб пазбегнуць гэтага, раім разгледзець, як аўтар сутыкае характар галоўнага персанажа з характарамі іншых герояў п'есы – былых аднавяскоўцаў, былога старшыні калгаса, афіцэра-марадзёра. Трэба паказаць, як Ігнат пераконвае іх у сваім жаданні застацца на сваёй зямлі і як у гэтых сцэнах па-сапраўднаму раскрываюцца характары дзеючых асоб. У заключэнні разгляда п'есы трэба задаць пытанне: у чым мае рацыю галоўны герой? Ігнат выступае не толькі супраць разграблення вёскі, але і супраць знішчэння сувязі чалавека са сваімі духоўнымі каранямі. Цаной свайго жыцця Ігнат Шаройка застаецца верным свайму слову, не можа згадзіцца з той думкай, што ў яго хаце будуць панаваць марадзёры.

Трэба сканцэнтраваць увагу слухачоў на жанры п'есы – трагікамедыя, дзе спалучаюцца камічныя (гумар Шаройкі ў трагічных, часта безвыхадных сітуацыях) і трагічныя (гібель героя) кампаненты. Трагічнымі з'яўляюцца канфлікт п'есы і характар галоўнага героя, але камізм – адзін з асноўных сродкаў стварэння характараў у гэтай п'есе і наогул у творчасці В. Ткачова. У гэтым плане можна прапанаваць слухачам параўнаць характар Ігната Шаройкі з характарамі іншых персанажаў драматургічных твораў В. Ткачова: старога Квача з камедыі «Шкірдзюкі займаюць абарону» і Макара з драмы «Стары і дарога». Слухачы павінны падрыхтаваць цытаты, у якіх найбольш дакладна паказаны рысы характару персанажаў.

Важны момант пры разглядзе п'есы – паказ мінулага Беларусі праз раскрыццё характараў персанажаў. Дарэчы, у творчасці В. Ткачова амаль няма твораў пра гістарычнае мінулае нашага краю, але, напрыклад, падзеі Вялікай Айчыннай вайны апасродкавана прысутнічаюць, у тым ліку і ў названых творах. Заваструць увагу слухачоў на гэтым пытанні – вельмі важны выхаваўчы, а таксама неабходны для раскрыцця ідэі твора момант. Праз лёсы Шаройкі, Квача, Макара прайшла вайна, якая адняла блізкіх людзей. На падставе параўнальнай цытатнай характарыстыкі варта зрабіць вывады: усіх трох персанажаў аб'ядноўваюць такія рысы, тыповыя для беларускай ментальнасці, як цярплівасць, добразычлівасць, ураўнаважанасць. Нягледзячы на тое, што ўсе яны пражылі нялёгкае жыццё, у іх няма злосці і нянавісці да людзей, да гістарычнага мінулага свайго краю.

Слухачы павінны падысці да думкі, што любоў да роднай зямлі, вялікая павага да людзей, іх жыцця, перажыванні за іх лёс складаюць аснову многіх твораў В. Ткачова. Але ў драматургічных творах, у адрозненне ад празаічных, цяжка вызначыць пазіцыю самага аўтара (што, безумоўна, стварае значныя цяжкасці пры разглядзе твораў гэтых жанраў на занятках і ў школе, і на падрыхтоўчым аддзяленні). Зрабіць

гэта магчыма, калі прааналізаваць некалькі твораў аднаго аўтара. Што тычыцца творчасці В. Ткачова, то тут упэўнена можна адказаць, што аўтар цалкам падтрымлівае свайго героя (герояў); думкі і ўчынкі таго ж Ігната Шаройкі, а таксама дзеда Квача, старога Макара – гэта думкі і ўчынкі самаго аўтара, які з вельмі вялікай любоўю і павагай паказвае нам, якія мы ёсць на самой справе. Драматургічныя творы В. Ткачова – гэта творы з глыбокай жыццёвай праблематыкай, творы, якія не пакідаюць абыякавым ніводнага ўдумлівага чытача і гледача.